Аўсейчык, У.Я. Эвалюцыя пахавання “нячыстых” нябожчыкаў у ХХ – пачатку ХХІ стагоддзя (па матэрыялах беларусаў Падзвіння) / У.Я. Аўсейчык // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 11. – Мн.: Права і эканоміка, 2011. – С. 317-323.

***Аўсейчык У.Я.***

# ЭВАЛЮЦЫЯ ПАХАВАННЯ «НЯЧЫСТЫХ» НЯБОЖЧЫКАЎ У ХХ – ПАЧАТКУ ХХІ СТАГОДДЗЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ)

*Полацкі дзяржаўны універсітэт*

Традыцыйным варыянтам пахавальнага абраду беларусаў Падзвіння з’яўляецца пахаванне людзей сталага ўзросту, якія памерлі «сваёй» смерцю (ад старасці). Такая абумоўленасць тлумачыцца сувяззю ў народнай свядомасці паняцця *век* (г.зн. працягласць жыцця чалавека) з яго *доляй*, якая яму даецца пры нараджэнні. «Век як тэрмін чалавечага жыцця (які не мае дакладнага колькаснага вымярэння) – час напоўнены, блізкі да долі, час выдаткоўвання першапачаткова закладзенай жыццёвай патэнцыі» [13, с. 40]. У народнай свядомасці гэта можа быць выражана наступным чынам: *«Ну ўжо нада ж усё, што чалавеку назначана ад Бога, нада ўсё прайці»* (Запісана У.Я. Аўсейчыкам, А. Круткіным, У.С. Філіпенкам у 2010 г., в. Шо Глыбоцкага р-на ад Г.І. Пілімон, 1935 г.н.). У сувязі з гэтым, натуральная смерць чалавека надыходзіць, калі той вычарпаў сваю жыццёвую сілу, патраціў яе на працягу ўсяго жыцця. Аднак такі варыянт з’яўляецца ідэальным. Як адзначае А.К. Байбурын, схема прадугледжвае адхіленне як у бок заўчаснай, так і ў бок прыпозненай смерці, г.зн. «недажытага веку» і «пераджытага веку» [2, с. 102]. Як і першы, так і другі выпадак з’яўляюцца непажаданымі, і іх «выпраўленне» ва ўмовах традыцыйнага грамадства патрабавала адпаведных рытуальных дзеянняў.

Уяўленне аб «пераджытым веку» больш характэрнае для паўднёвых славян. У некаторых раёнах Сербіі і Балгарыі па «зажыўшымся» старыкам нават спраўлялі пры жыцці памінкі, каб такім чынам пасродкам рытуалу абмежаваць працягласць іх «века» [2, с. 102]. Ва ўсходнеславянскай традыцыі такія ўяўленні не маюць шырокага распаўсюджання[1]. Больш актуальнымі для гэтага абшару з’яўляюцца ўяўленні аб заўчасна памерлых і памерлых «не сваёй» смерцю. Пра гэта ўпершыню адзначаў яшчэ Дз.К. Зяленін, прапанаваўшы канцэпцыю размежавання ўсіх нябожчыкаў на продкаў («дзядоў», «родителей») і закладных нябожчыкаў (памерлых заўчасна, не сваёй смерцю) [5].

Калі памерлыя «сваёй» смерцю пераходзілі ў катэгорыю «дзядоў», да якіх адносіліся з глыбокай пашанай і якіх рэгулярна паміналі, то заўчасна памерлыя характарызаваліся як «нячыстыя» нябожчыкі, якія пазбаўляліся

[1] Па меркаванню В.А. Седаковай, на ўсходнеславянскіх землях можна знайсці толькі слабыя адгалоскі падобных ўяўленняў – некаторыя асаблівасці адзення і транспарту на пахаванні старыкоў, а таксама паданні (характэрныя ў большасці для ўкраінскіх зямель) як некалі старыкоў забівалі («саджалі на лубок») [13, с. 41].

гэтай пашаны і памінання, а часта лічыліся нават небяспечнымі. Згодна з народнымі ўяўленнямі заўчасная смерць пакідала нябожчыку не патрачаную ў зямным жыцці энергію, якую ён мусіў траціць пасля смерці, але ўжо на шкоду людзям [7, с. 449]. Каб прадухіліць іх магчымую шкоду, пры пахаванні «небяспечных» нябожчыкаў існавалі спецыяльныя прыёмы, а таксама больш строга, чым ва ўсіх астатніх выпадках, сачылі за выкананнем абрадавых дзеянняў[2]. У сувязі з гэтым, у пахавальным абрадзе такіх памерлых значна даўжэй захоўваецца шэраг даволі архаічных элементаў. Сляды архаічнага ўяўлення аб «недажытым веку» яшчэ да нашага часу захоўваецца ў своеасаблівым характары пахавання моладзі. У гэтым плане цікавасць уяўляе пахавальнае адзенне маладых хлопцаў і дзяўчат, якія дасягнулі шлюбнага ўзросту, але пры жыцці шлюбам не пабраліся. Такіх нябожчыкаў прынята хаваць у вясельным строі («як пад вянец»): *«Як на вяселле: дзеўцы адзявалі вэлюм, белае плацце, а мальцу – касцюм, кветачку, ленту»* [14, с. 379]. Яшчэ і сёння захавалася традыцыя маладых нябожчыкаў з дому на могілкі не везці, а несці на руках [1, с. 203]. В.А. Седакова мяркуе, што пры суіснаванні ў лакальным варыянце абраду дзвюх традыцый перамяшчэння памерлага на могілкі: несці і везці, першая ўяўляецца больш архаічнай і характэрная якраз для пахавання «небяспечных» нябожчыкаў [13, с. 76-77].

З цягам часу старажытныя ўяўленні аб «саваёй»/«не сваёй» смерці і патэнцыйнай шкодзе нябожчыкаў, якія памерлі заўчасна, прыцярпелі значныя змены. Усялякая раптоўная і гвалтоўная смерць ужо не разглядаецца як прычына «хаджэння» нябожчыка, а памерлыя не лічацца «нячыстымі» і «небяспечнымі» (напрыклад, гэта датычыць маладых памерлых). А «некаторыя віды «не сваёй» смерці набываюць процілеглы статус «святой» смерці» [13, с. 46]. Як вынікае з матэрыялаў палявых этнаграфічных даследаванняў на Падзвінні, «святой» смерцю можа лічыцца смерць ад маланкі: *«<...> молнія забівае чалавека, які Бога дастойны»* (Запісана экспедыцыяй ПДУ у 1996 г., в. Клешчына Бешанковіцкага р-на ад Е.П. Карпусенка, 1914 г.н.). Але пры гэтым існуе лакальная варыятыўнасць у інтэрпрэтацыі падобнай смерці. Так, на Глыбоччыне смерць ад маланкі трактуецца супрацьлеглым чынам: *«Як пярун забіваў чалавека, то ён лічыўся вельмі грэшны»* (Запісана У.А. Лобачам у 2001 г., в. Вострава Глыбоцкага р-на ад А.Я. Кручкоўскай, 1921 г.н.).

Даволі істотныя змены на працягу XX – пач. XXI ст. закранулі пахавальны абрад малых дзяцей, як і ўяўленні, з ім звязаныя. Яшчэ з уплывам хрысціянства старажытныя ўяўленні аб памерлых дзецях распаліся на дзве традыцыі: адна датычыла нехрышчоных дзяцей, да якіх захаваліся адносіны як да «нячыстых», другая – хрышчоных, якія лічыліся анёламі [13, с. 46]. Па словах беларускага этнографа сярэдзіны XIX ст. П. Шпілеўскага, калі дзіця нараджалася нежывое, яго захіналі ў салому і хавалі дзе-небудзь у

[2] У вясковым асяроддзі і да цяперашняга часу захоўваецца перакананне, што няправільнае выкананне пэўнага абрадавага дзеяння (або невыкананне волі памерлага) можа прывесці да «хаджэння» нябожчыка пасля смерці [1, с. 201].

кутку сада, агарода і часцей за ўсё на гумнішчы. Калі ж дзіця жыло некаторы час і памірала без хросту, то яго хавалі за агароджай могілак і замест крыжа ставілі камень, або трохкутнік з асінавага дрэва [10, с. 104]. Забарона хаваць памерлых нехрышчоных дзяцей на агульных вясковых могілках строга выконвалася яшчэ ў першай палове ХХ ст. Падобныя ўспаміны сустракаюцца нават і сёння сярод вяскоўцаў сталага ўзросту: *«А вось дзеці ж паміралі часцей малыя. Як яшчэ не хрышчаны дзіцёнак? – Ну як ня хрышчаны, дык ужо дужа непрыятна. Дажэ не хацелі на кладбішчы хаваць, хавалі там з бірага кладбішча, там дзе ня свенчаныя кладбішча, там хаваюць»* (Запісана У.А. Лобачам у 2008 г., в. Сталіца Шаркаўшчынскага р-на ад Я.Л. Хаданёнак, 1931 г.н.). Як паказваюць матэрыялы палявых этнаграфічных даследаванняў, у другой палове ХХ – пач. ХХІ ст. такія ўяўленні значна эвалюцыянавалі. Ранейшае ўяўленне аб «нечыстаце» дзяцей, якія памерлі нехрышчонымі, у сучасным грамадстве замяняецца на супрацьлеглае ўяўленне аб іх «нявіннасці» і «нягрэшнасці»: «*А вот маленькі яшчэ дзіцёнак, такі нехрышчоный? – Ён яшчэ нягрэшный»* (Запісана экспедыцыяй ПДУ у 2010 г., в. Шо Глыбоцкага р-на ад Л.М. Анашкевіч, 1935 г.н.). У сувязі з гэтым, пахаванне малых дзяцей адбываецца зараз разам з астатнімі памерлымі: "*А дзяцей прыкапаюць да сваіх родных і туды хароняць*" (Запісана У.Я. Аўсейчыкам, А. Круткіным, І. Пятровым у 2010 г., в. Завулак Рускі Глыбоцкага р-на ад М.Ю. Радзюш, 1938 г.н.).

Да нашага часу ў беларускай вясковай супольнасці захоўваецца традыцыя «хрысціць» нехрышчоных дзяцей на могілках пасля смерці. Такі «хрост» часцей адбываецца падчас пахавання: *«А вот нехрышчоныя дзеці, яшчэ маленькія, што, тожа не харанілі раней на кладбішчы? <...> – А, гэткіх хароняць. Гэткага хароняць, самі вадой свянцонай пасвенцяць, хрэсцік павешаюць яму і ў магілцы закапаюць»* (Запісана У.Я. Аўсейчыкам у 2009 г., в. Осцевічы Міёрскага р-на ад Т.М. Крыўко, 1926 г. н.). Падобны рытуал мог выконвацца і святаром: *«Памершага дзіця бацюшка крысціў і даваў яму імя»* (Запісана экспедыцыяй ПДУ у 2001 г., в. Залессе Глыбоцкага р-на ад З.Ф. Козел, 1928 г.н.).

Асобную катэгорыю памерлых складаюць самагубцы, якія ў народнай свядомасці выразна адрозніваліся ад нябожчыкаў, што памерлі ад старасці. У адносінах да такіх памерлых у беларусаў існаваў іншы, чым для нябожчыкаў, якія памерлі «сваёй» смерцю, варыянт пахавальнага абраду. Самагубцаў маглі хаваць нямытымі, у той адзежы, у якой яны сустрэлі смерць, часам нават без труны. Па іх не спраўлялі памінкі і іх не адпявалі [10, с. 27]. Паўсюдна на Падзвінні самагубцаў забаранялася хаваць на агульных могілках. Месцамі іх пахавання часцей былі тыя локусы, якія ў народнай свядомасці ўстойліва суадносіліся з памежнай тэрыторыяй, або звязаныя з сімволікай хаосу (у багністых месцах, ля ростаняў, у канавах каля могілак і г.д.), каб, такім чынам, «гарантаваць бяспеку не толькі жывым, але і «добрым» нябожчыкам» [7, с. 450]. Па словах П. Шпілеўскага, магілы для самагубцаў выбіраліся на скрыжаваннях ці на ўзвышшах у лесе, якія затым звычайна расчышчаліся, каб іх было відаць здалёк для кожнага, хто б ні

праходзіў ці не праязджаў. У Віцебскай губерні, на вяршыні кургана садзілі асінавае дрэва, і калі яно вырастала вялікае, вешалі на ім забітых крумкачоў, соў, жаб і змей [10, с. 104-105].

Як пазначае Дз.К. Зяленін, на пач. XX ст. вясковае насельніцтва непакоіў ужо не столькі спосаб пахавання самагубцаў, колькі месца [4, с. 354]. Па-ранейшаму, катэгарычнай забароны датычыла пахаванне самагубцаў на агульных могілках. У шэрагу выпадкаў для пахавання самагубцаў нават існавалі асобныя могілкі. На пач. XX ст. такая асаблівасць была характэрна і для гарадскога насельніцтва Падзвіння. Так, у Полацку самагубцаў яшчэ ў 1920-я гг. хавалі на тэрыторыі старажытнага гарадзішча, дзе да гэтага часу хавалі таксама і хатнюю жывёлу [3, с. 111]. Падобныя ўспаміны яшчэ шырока захоўваюцца і зараз сярод вясковага беларускага насельніцтва Падзвіння: *«А самагубцаў нельзя на кладбішчы з усімі хараніць. Кладбішча было агароджана, абкапана раўком. І нельзя тут хаваць, нада за гэтым раўком. Бо што ён нядобра зробіў, павесіўся. Вот што вешаліся – іх не хавалі з усімі, бо самагубцы. За раўком хавалі»* (Запісана І. Азевіч, В. Аўсейчык у 2008 г., в. Глінішча Ушацкага р-на ад К.Н. Дрозд, 1927 г.н.). Такая сітуацыя тлумачыцца тым, што ва ўяўленнях вясковага насельніцтва могілкі яшчэ і сёння выразна вылучаюцца з навакольнай прасторы як месца «святое» і «чыстае». Прырода гэтай святасці, па меркаванню У.А. Лобача, з’яўляецца дваістай. Перадусім, яна вынікае з самога факта знаходжання там памерлых продкаў. Разам з тым, зыходны сакральны статус могілак абавязкова павінен быць легітымізаваны пасродкам адпаведных культавых дзеянняў хрысціянскага святара [8, с. 72]. Па гэтай прычыне самагубцы, якія лічацца «нячыстымі» нябожчыкамі, бо «аддалі» сваю душу д’яблу, не могуць быць пахаваныя разам з астатнімі продкамі: *«А што кажуць, як пахаваюць самагубцаў з усімі разам? – Ну казалі ж нільзя, і бацюшка кажыць няможна. Таму што он нехрышчоны шчытаецца, чорту аддадзены, душа яго. А кладбішча ходзяць, свяшчэннікі ж свянцаюць»* (Запісана У.С. Філіпенкам, С. Высоцкім, Я. Шаўчэнка у 2009 г., в. Рачныя Докшыцкага р-на ад А.А. Працукевіч, 1936 г.н. і У.П. Працукевіча, 1929 г.н.).

Парушэнне дадзенага патрабавання, па меркаванню беларускага вясковага насельніцтва, было непажаданым і магло прывесці да вельмі негатыўных наступстваў нават касмічнага плану: «*А ці казалі, чаму ня можна хараніць самагубцаў? – Ну, гавораць, дажджоў ня будзе»* (Запісана К. Шыталям у 2007 г., в. Шклянцы Докшыцкага р-на ад В.І. Шаркевіч, 1930 г.н.). Такое ўяўленне мае даволі архаічнае паходжанне і звязана з верай у тое, што памерлыя продкі могуць уплываць на будучы ўраджай, дабрабыт жывых нашчадкаў, а таксама на надвор’е [12, с. 33].

У сучасны перыяд пахаванне самагубцаў, нягледзячы на захаванне некаторых даволі архаічных элементаў, у большасці выпадкаў адбываецца па таму ж абраду, што і ўсіх астатніх памерлых. Праўда, нельга не адзначыць, што ў многіх выпадках абрад праводзіцца ў скарочаным варыянце, толькі з выкананнем найбольш важных абрадавых дзеянняў. Нават выбар месца пахавання такіх памерлых ужо не дыктуецца ранейшай традыцыяй, і

пахаванне самагубцаў адбываецца на агульных могілках. Ранейшая забарона хаваць самагубцаў на тэрыторыі вясковых могілак у наступным замяняецца на забарону хаваць такіх памерлых у цэнтральнай яе частцы: *«А вот гавораць, што вісельнікаў і на кладбішчы не харанілі? – Дзе-небудзь у канцы, не пасрадзі, а кала плота, у канцы. <...> Цяпер стараюцца дзе-небудзь кала краю»* (Запісана У.Я. Аўсейчыкам у 2009 г., в. Ульшына Міёрскага р-на ад Л.М.Алеська, 1939 г.н.). Раней, па словах рэспандэнтаў, на ускраіне агульных могілак адводзілася асобная частка для іх пахавання: *«А праўда што гавораць самаўбіц на кладбішчы не хавалі? – Раней не харанілі цяпер ужо хароняць. <...> упярод быў куточак адведзены для іх»* (Запісана У.Я. Аўсейчыкам, К. Путронкам, Н. Шыпіла у 2009 г., в. Тумілавічы Докшыцкага р-на ад Г.С. Дранковіч, 1934 г.н.).

Катэгарычнай забароны датычыла адпяванне і наступнае памінанне самагубцаў. Ролю строгага захавальніка дадзенага прадпісання ў сучасным грамадстве выконвае царква. Калі з цягам часу народныя ўяўленні падвяргаюцца зменам і пры пахаванні самагубцаў ужо не назіраецца многіх ранейшых забаронаў, то царкоўныя прадпісанні вылучаюцца большай устойлівасцю. А таму на сучасным этапе пры пахаванні самагубцаў ранейшыя рэгламентацыі могуць насіць толькі частковы характар: *«А цяпер, ці хароняць такіх людзей* [самагубцаў – *А.У.*]*? – Божа ўпасі. На кладбішчы хароняць, но ні атпіваюць па ім»* (Запісана У.Я. Аўсейчыкам у 2009 г., в. Осцевічы Міёрскага р-на ад Т.М. Крыўко, 1926 г.н.).

Да ліку іншых катэгорый «нячыстых» нябожчыкаў далучаюцца памерлыя, якія, як лічылася, пры жыцці займаліся чараўніцтвам. Згодна з народнымі ўяўленнямі, звышнатуральныя здольнасці чараўнікоў могуць тлумачыцца іх сувяззю з «нячысцікамі» і карыстаннем паслугамі «нячыстай» сілы для здзяйснення сваіх мэт [9, с. 282]. «Нячыстая» сіла, як лічацца, служыць чараўніку пры жыцці, а пасля смерці яго душа за гэта дастаецца чорту (уяўленне характэрнае усходнім і заходнім славянам [6, с. 529-530]). Таму незалежна ад часу (заўчасная або «свая» смерць) і абставінаў смерці чараўнікі ў традыцыйнай свядомасці беларусаў Падзвіння ўстойліва характарызуюцца як «нячыстыя» нябожчыкі.

Паўсюдна на Падзвінні і сёння распаўсюджана ўяўленне, што чараўнікі, якія не перадалі свае веды нашчадкам, паміраюць асабліва цяжка. Гэта ўяўленне звязвалася з тым, што душа чараўніка рагатая і ёй цяжка выйсці з цела, або з тым, што іх душы не могуць праходзіць праз вокны і дзверы, якія звычайна памячаліся крыжамі і праз якія анёлы праносяць «чыста хрысціянскую душу» [9, с. 284]. Падобныя ўяўленні захоўваюцца яшчэ і сёння: «*Чэрэз дзверы ён ня можыць выйсці, яго толькі вынісуць нячыстыя ў паталок*» [14, с. 377]. Таму для аблягчэння іх перадсмяротнай агоніі (для «выхаду душы») у сценах ці даху хаты неабходна рабіць дадатковыя адтуліны (разбіраць страху, столь), адзяваць на шыю хамут і г.д.: *«Калі чараўнік памірае, должэн перадаць каму-небудзь. Калі не памірае, падымаюць столь ці надзяваюць хамут»* [11, с. 207].

Як і іншых «нячыстых» нябожчыкаў, чараўнікоў не хавалі на агульных

могілках: *«Гэта як січас, дык яно, а як даўней, пры Польшчы, еслі ён такімі дзеламі занімаўся вот* [чараўніцтвам – *А.У.*], *утопленік, ці вісельнік, значыць тады такіх на кладбішчы не харанілі»* (Запісана экспедыцыяй ПДУ у 2001 г., в. Вострава Глыбоцкага р-на ад М.М. Рудака, 1925 г.н.). Месцам іх пахавання была тэрыторыя вакол могілак: *«А так гаварылі, што такіх* [чараўнікоў – *А.У.*] *дажа на могілках не хароняць, а толькі кала краю»* [11, с. 156].

На пахаванні чараўнікоў з мэтай прадухілення іх магчымага «вяртання» ў свет жывых («каб не хадзілі») многія абрадавыя дзеянні выконваліся з адваротным вектарам: памерлага выносілі галавой наперад, на скрыжаванні дарог труну пераварочвалі кругом [13, с. 49]. Сэнс такіх дзеянняў – «заблытаць» памерлага, каб той забыў дарогу і не вяртаўся назад. Падобныя ўспаміны сустракаюцца сярод беларусаў Падзвіння і ў сучасны перыяд: *«Чараўнікоў харанілі за кладбішчам. У гроб клалі ў другую сторану галавой. Харанілі галавой на ўсход, а не на захад <...>»* (Запісана экспедыцыяй ПДУ у 1996 г., в. Заручэўе Бешанковіцкага р-на ад Г.А. Цямняк, 1912 г.н.). Часам, для таго каб «непрытомнік» не «хадзіў» пасля смерці, існавалі і больш радыкальныя метады. Для гэтага раскопвалі яго магілу, адсякалі галаву, лажылі яе паміж ног і працінали асінавым калом [9, с. 294]. Як паказваюць матэрыялы сучасных палявых даследаванняў, падобныя ўяўленні, як і многія ранейшыя прадпісанні адносна пахавання чараўнікоў, ужо не характэрныя для сучасных вяскоўцаў.

Такім чынам, за перыяд XX – пач. XXI ст. пахавальная абраднасць беларусаў Падзвіння адносна «нячыстых» нябожчыкаў прыцярпела значныя змены, як і стаўленне да дадзенай катэгорыі памерлых. У сучасным грамадстве памерлыя нехрышчонымі дзеці перастаюць разглядацца як «нячыстыя» нябожчыкі, а іх пахаванне адбываецца разам з астатнімі памерлымі. Пахаванне самагубцаў таксама адбываецца на агульных могілках і праводзіцца па таму ж абраду, што і звычайных памерлых, праўда, часта ў скарочаным варыянце. Зніклі ранейшыя прадпісанні і з пахавальнага абраду памерлых, якія, як лічылася, пры жыцці займаліся чараўніцтвам. Але ў той жа час стаўленне да памерлых чараўнікоў у сучаснай вясковай супольнасці па-ранейшаму застаецца негатыўным. Нягледзячы на такія істотныя змены, трэба адзначыць бытаванне нават на пачатку XXI ст. шэрагу даволі архаічных уяўленняў, якія датычаць пахавання «нячыстых» памерлых, галоўным чынам, сярод вяскоўцаў сталага ўзросту.

## ЛІТАРАТУРА


1. Аўсейчык, У.Я. Пахавальна-памінальная абраднасць вясковага беларускага насельніцтва Падзвіння ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя / У.Я. Аўсейчык // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2010. – №7. – С. 199-210.
2. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре: Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А.К. Байбурин. – СПб.: Наука, 1993. – 240 с.
3. Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX – XVIII стст.) / Д.У. Дук. – Наваполацк:

ПДУ, 2010. – 180 с.

4. Зеленин, Д.К. Восточнославянская этнография / Д.К. Зеленин. – М.: Наука, 1991. – 511 с.
5. Зеленин, Д.К. Избранные труды. Очерки русской мифологии: Умершие неестественной смертью и русалки / Вступ.ст. Н.И. Толстого; подготовка текста, комент., указат. Е.Е. Левкиевской / Д.К. Зеленин. – М.: Издательство «Индрик», 1995. – 432 с.
6. Левкиевская, Е.Е. Колдун / Е.Е. Левкиевская // Славянские древности: Этнолингвинистический словарь в 5-т. / Институт славяноведения РАН; под общей редакцией Н.И. Толстого. – М., 1999. – Т.2: Д – К (Крошки). – С. 528-534.
7. Лобач, У. Самагубцы / У. Лобач // Беларуская міфалогія: Энцыкл. слоўнік. – Мн.: Беларусь, 2004. – С. 449-451.
8. Лобач, У.А. Сімвалічны статус і рытуальныя функцыі могілак у беларускай народнай культуры вярхоўяў Бярэзіны і Віліі ХХ – пач.ХХІ ст. / У.А. Лобач // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. – 2008. – № 1. – С. 71-82.
9. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи... Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. Типо-Литограф., 1897. – 307 с.
10. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / Рэд.кал. А.С. Фядосік (гал.рэд.) і інш.; Укладанне тэкстаў, уступ. артыкул і камент. У.А. Васілевіча; Артыкул, сістэматызацыя і камент. напеваў Т.Б. Варфаламеевай / У.А. Васілевіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.
11. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып.1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч.2. / склад. У.А. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк: ПДУ, 2006. – 332 с.
12. Пропп, В.Я. Русские аграрные праздники: (Опыт историко-этнографического исследования) / В.Я. Пропп. – СПб.: Терра – Азбука, 1995. – 176 с.
13. Седакова, О.А. Поэтика обряда: Погребальная обрядность восточных и южных славян / О.А. Седакова. – М.: Индрик, 2004. – 320 с.
14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка і інш.; Складальнік Т.Б. Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 2004. – 910 с.

## РЕЗЮМЕ

В статье на основе материалов белорусов Придвинья рассматривается эволюция погребального обряда «нечистых» покойников, а также представлений связанных с их погребением, на протяжении XX – нач. XXI в. Особое внимание уделено анализу изменений в погребении таких категорий «нечистых» покойников как некрещеные дети, самоубийцы и колдуны.

## SUMMARY

The evolution of funeral ceremony of the “un-pure” dead men and representations connected with their burial during the 20$^{th}$-beginning of the 21$^{th}$ centuries are examined in the article on the basic of materials of Belarusians of Dvina region. A special attention is given to the analysis of the changes in the burial ceremonies of such categories of the “un-pure” dead men as not-christen children, suicides and warlocks.